ўзорны тэкстыль мае вызначальную ролю ў распрацоўцы вобразнай, кампазіцыйнай і пластычнай структуры народнага адзення, патрабуе павышанай увагі да ўзорнага ткацтва як сродку ўвасаблення нацыянальнай своеасаблівасці ў сцэнічным касцюме.

**Літаратура**


1. Исенко С.П. Эстетика русского народного костюма и проблема его сценического воплощения: Автореф. канд. искусствоведения: 17.00.05 / НИИ теории и истории изобразительных искусств Российской академии художеств. – М., 1993. – 25 с.
2. Королева Н.С., Кожевникова Л.А. Современное узорное ткачество. – М.: Легкая индустрия, 1970. – 108 с.
3. Курилович А.Н. Белорусское народное ткачество. – Мн.: Наука и техника, 1981. – 119 с.: ил.
4. Маленка Л.І. Беларускае народнае адзенне: Метад. дапам. – Мн.: БелІПК, 1992. – 64 с.: іл.
5. Раманюк М. Беларускае народнае адзенне. – Мн.: Беларусь, 1981.


## РОЛЯ ЎЛІКУ Ў ЗАХАВАННІ ДЛЯ НАШЧАДКАЎ КУЛЬТУРНЫХ І ГІСТАРЫЧНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ РОДУ РАДЗІВІЛАЎ


**Я.Ю. Беланожкіна**

Навуковы кіраўнік – Г.Я. Жыткевіч, кандыдат эканамічных навук, дацэнт

УА "Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт", г. Баранавічы, Беларусь


У Вялікім княстве Літоўскім, Рускім, Жамойцкім, у склад якога некалі ўваходзіла тэрыторыя сучаснай Беларусі, было шмат багатых родаў, але цяжка знайсці больш магутны і заможны, чым Радзівілы. Ён лічыўся самым высакародным сярод еўрапейскай арыстакратыі. На працягу стагоддзяў з роду Радзівілаў выйшлі больш за сорак сенатараў, канцлераў, ваяводаў, кашталянаў, маршалкаў.

У канцы XVI ст. Нясвіж стаў даволі буйным горадам. У фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі захоўваюцца прывілеі, нададзеныя яму каралямі Стэфанам Баторыем і Янам III Сабескім, грамата князя Мікалая Радзівіла аб пацвярджэнні Нясвіжу магдэбургскага права, датаваная 1586 г., гарадскі статут.

Магдэбургскае права, якое склалася у XIII ст. ў Германіі, давала гараджанам самакіраванне, судовы імунітэт, падатковыя льготы, магчымасць займацца рамяством, гандлем, земляробствам, ствараць рамесныя аб'яднанні – цэхі. Атрыманне такога права гарадамі Беларусі і Літвы азначала, што яны дасягнулі высокага ўзроўню эканамічнага і сацыяльнага развіцця і зраўняліся ў гэтых адносінах са шматлікімі нямецкімі і польскімі гарадамі.

У XVI ст. Радзівілы толькі па лініі Мікалая Чорнага валодалі 61 горадам, 6 замкамі, 1321 вёскай, якія складалі 53 стараствы.

У сярэдзіне XVIII ст. у Нясвіжы актывізавалася развіццё промыслаў. У 1758 г. у замку налічвалася 85 рамеснікаў. У горадзе працавалі палатняны, шавецкі, слясарны, ткацкі цэхі, майстэрні мастацкага ліцця, пачаўся выраб габеленаў і залататканых слуцкіх паясоў.

Хуткае эканамічнае і сацыяльнае развіццё зрабіла ўплыў на тэхніку вядзення ўліку. У прыватнасці, неабходным было ўдасканаленне тэхнікі ўліку, што спрыяла стварэнню лічыльнай машыны ў Нясвіжы ў XVIII ст. мясцовым гадзіннікавым майстрам Еўнай Якабсанам. Машына дзевяціразрадная, на ёй можна было выконваць складанне і адыманне. Множанне ажыццяўлялася як паўторнае складанне, а дзяленне – як паўторнае адыманне. Колькасць дзеянняў фіксавалася. Машына ўяўляла сабой сістэму зубчастых перадач з доўгімі "пальцамі", мела незвычайныя вузлы. Па знешнім выглядзе гэта – металічная скрынка з багата ўпрыгожанай накрыўкай. Вынаходства адносіцца да ліку тых прыбораў, якія маюць вялікае гістарычнае значэнне [1, 68].

Трагічныя падзеі 1812 г. прынеслі гораду разбурэнні і заняпад, вынікі якіх адчуваліся доўгія дзесяцігоддзі. Толькі ў 1875 г. Радзівілы вярнуліся ў Нясвіж.

Многія старажытныя кнігі, прысвечаныя Нясвіжу, рукапісы, якія належалі мясцовым аўтарам, розныя дакументы ў свой час захоўваліся ў радзівілаўскай бібліятэцы і архіве. Ён пачаў складвацца ў 1551 г., калі Мікалай Радзівіл Чорны атрымаў права захоўвання ў Нясвіжы так званай Літоўскай метрыкі – дзяржаўнага архіва Вялікага княства Літоўскага. Некаторыя яго дакументы адносяцца да часоў Ягайлы. У архіве былі таксама лісты Пятра І, Людовікаў XV, XVI, Карла XII, Багдана Хмяльніцкага. Захавалася шмат каштоўных дакументаў пра першыя беларускія мануфактуры, грамадскае жыццё Беларусі і Літвы; можна сустрэць пералік прыгонных павіннасцей сялян, дагаворы з замежнымі майстрамі – усяго больш за 500 тысяч дакументаў. Лёс іх драматычны. Першая радзівілаўская бібліятэка была заснавана ў 1600 г. У каталогах налічвалася больш за 20 тысяч тамоў на розных мовах. У 1772 г. бібліятэка была канфіскавана і перавезена ў Пецярбург. Па загаду Кацярыны ІІ яе перадалі ў Акадэмію навук, туды трапіла 96 скрынь – 14892 кнігі, без уліку гравюр, картаў і нот. На жаль, Радзівілаўскі кнігазбор моцна пацярпеў падчас пажару ўжо ў наш час. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі і Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Акадэміі навук Беларусі імя Якуба Коласа таксама захоўваюцца кнігі з нясвіжскай бібліятэкі Радзівілаў, але сабранай ужо ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў. Іх лёгка пазнаць па экслібрысах, своеасаблівых інвентарных знаках, якія спрашчалі вядзенне ўліку.

Велізарныя багацці былі сабраны ў нясвіжскім замку. Асабліва вялікія памеры набылі яны ў канцы XVIII ст. Па словах У. Сыракомлі, сяляне плацілі за ўсё: за лес, за пчол, за рыб, а магчыма "і за само паветра".

Нясвіжскія магнаты маглі дазволіць сабе жыць у раскошы, валодаць выдатнымі творамі мастацва, утрымліваць пышныя дварцовыя капэлы і тэатры, здзіўляць эксцэнтрычнымі выхадкамі.

Ёсць шмат пісьмовых сведчанняў аб існаванні незлічоных багаццяў нясвіжскіх Радзівілаў. Расійскі пасол князь М.В. Рапнін, які быў у складзе світы караля Станіслава Аўгуста, апошняга манарха Рэчы Паспалітай, пісаў у данясенні імператрыцы Кацярыне ІІ: "Кароль заехаў да К.С. Радзівіла ў Нясвіж. Пасля бліскучага феерверку і абеду на 300 асоб кароль спусціўся ў падзямелле замка і ўбачыў залатыя злiткі, укладзеныя да самай столі. Золата было на сотні пудоў, мноства залатых рэчаў ды 12 апосталаў з гэтага металу і срэбра, усыпаныя каштоўнымі камянямі".

З захапленнем пісаў аб скарбах Радзівілаў і міністр замежных спраў Расійскай імперыі А. Чартарыскі: "Багаты замак у Нясвіжы. У 18 залах адных толькі ўпрыгожанняў сабралася на 5 альбо 10 мільёнаў дукатаў. Каштоўныя калекцыі зброі, карцін, кніг, брыльянтаў. Але няма нічога даражэйшага, чым калекцыя "12 апосталаў", 5 з іх чыстага золата і ўсыпаныя каштоўнымі камянямі".

У дзевятым томе працы "Расія. Поўнае геаграфічнае апісанне нашай айчыны", які выдадзены ў Пецярбургу ў 1905 г., запісана: "Зберaглося, між іншым, паданне, што тут (у Нясвіжы) былі схаваны велізарныя, масіўныя срэбраныя статуі дванаццаці апосталаў, багаты архіў, у якім зберагалася шмат пісьмаў еўрапейскіх манархаў, а таксама важныя дакументы па гісторыі Літвы, Польшчы. Акрамя таго, тут былі дыпломы, прывілеі, граматы, сапраўдны акт уніі і була папы Урбана XII. Куды ўсё гэта падзелася – невядома".

Другое пытанне – адкуль трапілі тыя унікальныя рэчы ў скарбніцу? Гісторыкі лічаць, што каштоўная калекцыя "12 апосталаў" магла прыбыць у Нясвіж з Канстанцінопаля. Рацыянальнае зерне ў гэтай версіі ўсё ж ёсць, таму што сапраўды сын князя Мікалая Сіроткі, Сыгізмунд Карл, быў рыцарам мальтыйскага ордэна. У 1609 г. ён заснаваў у Сталовічах (сёння веска недалёка ад горада Баранавічы) камандорства, адкуль разам з крыжакамі ажжыццяўляў паходы на Канстанцінопаль. Сярэбраны набор быў падораны Мікалаю Радзівілу Сіротку рымскім папам.

Вялізныя памеры багаццяў Радзівілаў патрабавалі сістэматычнага ўліку. Кожная рэч Радзівілаў – ад маленькага пярсцёнка да вялізных замкавых гармат, каштоўнасці, скарбніцы, карціны, мэбля, пазначаліся фамільным знакам.

У 1808 г. князь Дамінік Радзівіл загадаў правесці рэвізію сваёй скарбніцы. Цікавасць выклікае апісанне цыборыума (месца ў алтары). Срэбныя дзверы да гэтага цыборыума ўпрыгожвалі фігуры пазалочаных апосталаў. Робіцца выснова, што знакамітыя апосталы ў скарбніцы не былі асобнымі скульптурамі, а складаліся ў кампазіцыю на дзвярах.

Не аднойчы рабілі спробы знайсці скарб немцы – і ў першую, і ў другую сусветныя войны. У 1941–1944 гг. яго шукала спецыяльная сапёрная рота. Шмат каштоўных рэчаў было знойдзена і адпраўлена ў Германію, але галоўнай скарбніцы так і не знайшлі. Трэба яшчэ адзначыць і той факт, што ў Нясвіжы знайшлі некаторую колькасць каштоўнасцей, якія ўваходзілі ў шырока вядомы спіс награбаванай Напалеонам маёмасці. Спробы знайсці скарбніцу Радзівілаў не спыніліся і ў наш час. З'яўляюцца новыя сведчанні, гіпотэзы, версіі [2, 14].

У выніку праведзенага даследавання гістарычных крыніц пра жыццё роду Радзівілаў з часоў ВКЛ і да пачатку XX ст. можна зрабіць наступныя высновы:

– род Радзівілаў валодаў мноствам гістарычных і культурных каштоўнасцей, для захавання якіх патрэбен быў іх улік;

– у розных крыніцах сустракаюцца звесткі пра перапісы каштоўнасцяў, рэвізіі (1808 г., 1901 г.), а гэта, як вядома, з'яўляецца метадам бухгалтарскага ўліку, які забяспечвае абарону маёмасці;

– стварэнне лічыльнай машыны ў XVIII ст. у Нясвіжы – вынік развіцця рамёстваў і пашырэння патрэбы ва ўліку і яго ўдасканаленні;

– дзякуючы перыядычным перапісам, рэвізіям таго часу, захаваліся звесткі пра культурныя і гістарычныя каштоўнасці роду Радзівілаў, якія зараз захоўваюцца ў музеях Беларусі, Расіі, Польшчы, Літвы і іншых краінах свету, а таксама звесткі пра каштоўнасці, якія зараз лічацца страчанымі.

**Літаратура**

1. Майстроў Л. Навуковыя прылады і інструменты. – М.: Навука і тэхніка, 1968.
2. Ненадовец А. Тайны Радзівілаўскіх скарбаў // Газета "Секретные исследования".– 2004.– № 20.– кастрычнік.
3. Нясвіж і Радзівілы / К.Я. Шышыгіна-Патоцкая.– Мн.: Беларусь, 2002. – 240 с.

## BEE DANCE – БЕЛОРУССКИЙ ФОЛЬКЛОР СКВОЗЬ ПРИЗМУ АМЕРИКАНСКОЙ КУЛЬТУРЫ

**Л.Н. Богданова**

Научный руководитель – Н.П. Яконюк, доктор искусствоведения

УО "Белорусский государственный университет культуры и искусства", г. Минск, Беларусь

Белорусское музыкальное искусство является неотъемлемой частью мировой культурной цивилизации. Глубокая приверженность коренных белорусов к обычаям и традициям своих предков определила наиболее отличительные черты современной национальной музыкальной культуры – сохранность ее корневого слоя и актуальность в наше время.

Белорусский народ находится на критическом переломе в своем социокультурном существовании – утверждает и возрождает старину, неповторимость и самобытность национальной культуры. Одна из конечных целей фольклора – воспитание высоко духовного человека, который является ярким представителем своего народа, а также уважает культуру других наций.

Контакт профессиональной музыки с народной – неизбежное явление каждой национальной культуры. Образование на определенной ступени музыкального развития